ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта
Т.М.Ражэва

# ІНСТРУКЦЫЯ

## аб парадку арганізацыі і правядзення раённага агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў "Свет захапленняў"

1. Сапраўдная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў, якія дзейнічаюць пры структурных падраздзяленнях дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" (далей - Агляд – конкурс)
2. Мэтамі і задачамі Агляду –конкурсу з'яўляюцца: выяўленне новых сучасных форм дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў,вызначэнне аматарскага руху, далучэнне насельніцтва да каштоўнасцей белрускай культуры, прыцягненне да культурна –масавых мерапрыемстваў розных узроставых катэгорый насельніцтва абагульненне існуючага вопыту, яго прапаганда і ўкараненне ў практыку клубнай работы, стымуляванне прафесійнага майстэрства кіраўнікоў аматарскіх аб'яднанняў
3.Арганізатарам агляду-конкурсу з'яўляецца дзяржаўная ўстанова культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры".
4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Агляду –конкурсу арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.
5. Кантроль за ходам правядзення агляду-конкурсу ажыццяўляе аддзел метадычнай работы дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры".
6. Агляд –конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.
7. У Аглядзе –конкурсу прымаюць удзел дзіцячыя і дарослыя аматарскія аб'яднанні структурныя падраздзяленні ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры".
8. Агляд-конкурс праводзіцца на працягу лютага – сакавіка 2025 года (адпаведна графіку).
9. На Агляд –конкурс кожная клубная ўстанова прадстаўляе адкрытае або расшыранае пасяджэнне аднаго аматарскага аб'яднання (або некалькіх), якое найбольш яскрава адлюстроўвае накірунак яго дзейнасці.
10. Для ўдзелу Аглядзе- конкурсе неабходна падрыхтаваць паказ адкрытага пасяджэння, якое найбольш яскрава адлюстроўвае накірунак дзейнасці аб'яднання, адпавядае яго статуту. Працягласць праграмы

павінна складаць не меньш 30 хвілін. Калі адкрытае пасяджэнне праводзіцца на адкрытых пляцоўках, то для яго дэманстрацыі неабходна ўлічваць наяўнасць раставых лялек, аб'ёмнасць рэквіўітк, абсталяваную пляцоўку для гледача і г.д. Адкрытыя пасяджэніі праводзяцца з запрашэннем мясцовага насельніцтва.

Прадстаўляецца накапляльная папка-партфоліа за 2024-2025 гг.( планы работы, сцэнарныя матэрыялы, фота або відэаматэрыялы, копіі водгукаў сродкаў масавай інфармацыі аб творчай дзейнасці аматарскага аб'яднання за апошнія 2 гады, арганізуецца выстаўка-прэзентацыя і інш.

11. Пры падвядзенні вынікаў журы дае ацэнку паказу адкрытага пасядэння, улічваючы творчую задуму і арыгінальнасць ідэі адкрытага пасяджэння, актуальнаць выбару тжмы, кампазіцыйную пабудову праграмы і разнастайнасць форм пасяджэння, майстэрства сцэнічнай прасторы, мастацкае і музычнае афармленне.

12. Вынікі агляду – конкурсу падводзяцца ў красавіку 2025 года

13. Пры падвядзенні вынікаў агляду- конкурсу ўлічваюцца наступныя крытэрыі:

- рэжысёрскае рашэнне;
-сучаснасць формы работы;
-мастацкі ўзровень сцэнарнага матэрыялу і яго адпаведнасць накірунку дзейнасці аб'яднання;
-мастацкі ўзровень і артыстызм вядзення пасяджэння.

14. Вынікі агляду– конкурсу будуць падводзіцца ў дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая і дарослая) па наступных накірунках дзейнасці:

- грамадска – культурны;
-гісторыка – краязнаўчы;
-традыцыйнай народнай культуры;
-прыродазнаўчы;
-фізкультурна – аздараўленчы;
-сямейн а– бытавы;
-мастацкі;
-дэкаратыўна – прыкладная творчасць

15. Лепшыя 3 адкрытыя пасяджэнні аматарскіх аб'яднанняў будуць прадстаўлены да ўдзелу ў абласным аглядзе – конкурсе у маі 2025 года.

Дадатак 1
аб парадку арганізацыі і правядзення раённага агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

## СКЛАД ЖУРЫ
раённага агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

| | |
|---|---|
| Сабінская Г.С. | намеснік дырэктара ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”; |
| Камінская В.І. | мастацкі кіраўнік ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”; |
| Барахоўская Л.П. | загадчык метадычнага аддзела ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”; |
| Крывянкова В.К. | метадыст па рабоце з клубнымі фарміраваннямі метадычнага аддзела ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”; |
| Юркевіч Н.В. | загадчык аддзела народнай творчасці і культурна - дасугавай дзейнасці ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры” |